**А. У. Травіна**

# ШЛЯХЕЦКАЯ ДЭМАКРАТЫЯ ЯК АСНОЎНАЯ ПРЫЧЫНА ЗАНЯПАДУ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Нельга адмаўляць, што прычын заняпаду Рэчы Паспалітай было некалькі, аднак я жадаю звярнуць больш увагі менавіта на шляхецкую дэмакратыю і падкрэсліць яе ролю ў знікненні гэтай дзяржавы.

У Наказе Гродзенскага павятовага сейміка паслам на Варшаўскі сейм аб заняпадзе Рэчы Паспалітай і яго прычынах 22 марта 1773 года напісана, што *крыніца крызісу краіны - гэта пастаяннае бескаралеўе, з-за якога лёгка ўзнікаюць беспарадкі. Не забяспечана прыняцце рашэння сеймамі, чаму і няма ні ўнутранай, ні знешняй бяспекі. Няма сілы, якая забяспечыла б выкананне законаў.* З гэтага дакумента можна зразумець, што менавіта ўнутраная палітыка ў першую чаргу паслабляла дзяржаву. Звяртаючыся да крыніц бескаралеўя, трэба нагадаць, што ў 1572 годзе памёр апошні прадстаўнік дынастыі Ягелонаў, што пакінула дзяржаву без лідара. Пасля гэтага пачалася чарада выбарных манархаў, на якую даволі проста было паўплываць. Таксама магнаты ці шляхта маглі падкупіць ўдзельнікаў сейма, каб тыя ў пэўны час выкрыкнулі “liberum veto” і не далі магчымасці выбраць непажаданага караля. Іншыя ж слаі насельніцтва зусім не мелі права ўдзельнічаць у жыцці дзяржавы. Па Канстытуцыі 3 мая 1791 года ў сеймах маглі ўдзельнічаць мешчане, але толькі буйнейшых гарадоў, якімі ў Вялікім Княстве Літоўскім лічыліся Вільна і Магілёў. Але ў такім выпадку жыхары гарадоў усё роўна не мелі роўныя з шляхтай правы, таму што яны ўдзельнічалі ў сеймах у якасці аблегатаў. Якім жа чынам мы прыйшлі да адсутнасці моцнага манарха і цэнтралізаванай улады?

На маю думку, праз занадта вялікае пашырэнне правоў шляхты. Першае такое дакументальна зафіксаванае павелічэнне правоў адбылося пры князі Александры ў 1492 годзе. Але ў гэты час, канешне, нельга размаўляць пра Рэч Паспалітую. Аднак можна зразумець, што праблема абмежавання манарха з'явілась яшчэ да стварэння агульнай дзяржавы, інакш кажучы, можна дапусціць, што да ўзнікнення Рэчы Паспалітай прыйшлі ўжо з гэтым пытаннем. Звяртаючыся да меркаванняў замежных гісторыкаў, напрыклад, брытанскага гісторыка Рычарда Батэрвік-Паўлікоўскага, трэба працытаваць: *канец дзяржавы трэба ацэньваць не толькі праз раздзелы, а варта вярнуцца да глыбокага крызісу, які цягнуўся больш за 70 гадоў, з сярэдзіны XVII да першых дзесяцігоддзяў XVIII стагоддзя.* На маю думку, вельмі цяжка знішчыць дзяржаву праз знешні ўплыў, калі ўнутры яна моцная, таму я лічу, што шляхецкую дэмакратыю як велізарную частку ўнутранай палітыкі можна лічыць адной з галоўных прычынай заняпаду Рэчы Паспалітай.